# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
14 МАЯ
1992 ГОДА
№ 9 (1675)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА


## КРОК У АДЗІН БОК

Замежныя госці — справа для нас ужо звычайная. На гэты раз аддзел замежных сувязяў БДУ сумесна з Цэнтрам маладзёжных ініцыятыў прымаў 13 прадстаўнікоў Цэнтральнага Мічыганскага універсітэта (ЗША). Прафесар-сацыёлаг Джозеф дэ Болт, які, дарэчы, у Мінску ўжо трэці раз, адзначыў у размове з карэспандэнтам «БУ», што гэты візіт звязаны з сумеснай амерыкана-савецкай праграмай наладжвання цесных узаемаадносін паміж універсітэтамі.

Пятнаццаць амерыканскіх універсітэтаў паспрабавалі знайсці сваякоў у былым СССР. Цяпер Йельскі універсітэт сябруе з Маскоўскім, Цехаскі — з Іркуцкім, Гарвардскі — з Кіеўскім.

Мічыганскі універсітэт плануе, акрамя кароткіх візітаў, працяглыя, прыкладна на год, звязаныя з абменам студэнтамі ў мэтах навучання. І яшчэ адзін з накірункаў супрацоўніцтва — абмен спецыялістамі.

Амерыка! Вось дзе б павучыцца! Здаецца, што гэта толькі мары. Нават амерыканскаму студэнту працяглы візіт да нас абыдзецца ў 60 тысяч доларaў. А для нашага беднага універсітэта цяпер і кароткія візіты вельмі стратныя.

САКРЭТ ФІРМЫ

## ІНЖЫНЕРАМ МОЖАШ ТЫ НЕ БЫЦЬ...

Сярод 15 тысяч чалавек, якія зарэгістраваны ў якасці беспрацоўных Беларускім цэнтрам занятасці, самую шматлікую групу складаюць выпускнікі ВНУ.

Мала шанцаў знайсці работу па спецыяльнасці ў настаўнікаў рускай мовы і літаратуры, гісторыі, матэматыкі, фізікі, а таксама ў эканамістаў, праграмістаў, спецыялістаў па электроніцы. Кошт працы інжынера-праграміста пры прапанове вакансій тым, хто на чарзе, ацэньваецца ў 400—700 рублёў (для параўнання: грузчыку прапануюць 2 тысячы). Самай надзейнай у цэнтры занятасці лічаць прафесію бухгалтара. Спецыялісты раяць дзяўчатам, якія вучацца ў ВНУ па інжынерных спецыяльнасцях, перакваліфікавацца, пакуль не позна.

На апошнім пасяджэнні прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь адзначалася, што ў сёлетнім годзе чакаецца скарачэнне колькасці працоўных месцаў на 25—30 працэнтаў.

У ДАПАМОГУ АБІТУРЫЕНТУ

## НЕ ЎПЭЎНЕНЫ-ПАСТУПАЙ

Чалавек хапаецца за кожную магчымасць дзеля набліжэння да сваёй мэты. Нават упэўненыя ў тым, што ведаюць шмат, не пашкадуюць, пэўна, 350 рублёў за два тыдні караткатэрміновых падрыхтоўчых курсаў, якія прапануе факультэт давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі моладзі БДУ.

Традыцыйна курсы пачынаюць работу перад самымі ўступнымі экзаменамі — з 1 да 14 ліпеня, і рыхтуюць да паступлення на спецыяльнасці: матэматыка, матэматычная электроніка, механіка, прыкладная матэматыка, эканамічная кібернетыка, праграмнае забеспячэнне ВТ і АС, фізіка, радыёфізіка і электроніка, хімія, біялогія, геаграфія, гісторыя, архівазнаўства і музеязнаўства, міжнародныя адносіны, эканоміка, філасофія, сацыялогія, паліталогія, журналістыка, правазнаўства, руская мова і літаратура, беларуская мова і літаратура.

## ШТО Ў ЦАНЕ?

Студэнты клапоцяцца аб сваім здароўі, нягледзячы нават на тое, што кошт пуцёўкі ў вядомы санаторый-прафілакторый БДУ па вуліцы Курчатава падскачыў да 250 рублёў. Але ж гэта кветачкі, бо ў студэнцкім прафкоме мы даведаліся, што поўны кошт такой пуцёўкі — 1200 рублёў. Так што студэнт плаціць у дзень каля 10 рублёў; 15 рублёў штодзённа адлічвае рэктарат, а яшчэ 18 — прафсаюзы.

У кожны заезд, як і раней, прафілакторый наведвае да 150 чалавек. Калі вы стаіце на дыспансерным уліку ў паліклініцы, то маеце права два разы на год паехаць адпачыць. Для жадаючых наведаць прафілакторый звыш нормы адзіная перашкода — аплата поўнага кошту пуцёўкі.

## Культ—прагноз

*Супрацоўнікі студэнцкага клуба ўжо сёння заклапочаны празаічнымі праблемамі, што напаткаюць іх у ліпені: прыём акадэмічнага хора і аркестра Бохумскага універсітэта (Германія) колькасцю ў 210 чалавек. Госці будуць выступаць у Беларускай дзяржаўнай філармоніі. На долю ж студклуба выпала забеспячэнне ўмоў для іх пражывання.*

ЗАЛІКОЎКА НА ЛЕТА

## ПАПРАЦАВАЦЬ? ПАСПРАБУЙ!

У гэтым годзе створана амаль напалову менш студэнцкіх атрадаў, чым у мінулым. Усяго толькі дваццаць пяць.

Адна з прычын — раптоўнае пераўтварэнне бясплатных медаглядаў у платныя. Быццам бы і грошы невялікія (37 рублёў за аднаго студэнта), і выплочвае іх цэнтр па працаўладкаванню і занятасці моладзі, але на студатрадаўскі рух уплываюць такія перамены самым што ні на ёсць адмоўным чынам. Ні рамантычны туман, ні аргумент непапоўненых грашыма кашалькоў амаль нікога не заахвочваюць.

Мажліва, псуюць гульню і канкурэнты, якія выступаюць у ролі пасрэднікаў паміж студэнтамі і гаспадаркамі. У канкурэнтаў усё значна прасцей: ніякага медагляду. А ў такія краіны, як Малдова, наогул ехаць небяспечна. І рэктарат цяпер не лічыць летнюю працу студэнтаў уласным клопатам. Будатрад — для добраахвотнікаў. А вось восеньскі працоўны дэсант, хутчэй за ўсё, застанецца ў наш эканамічна нестабільны час традыцыйна-абавязковым яшчэ доўга.

І ўсё ж, хто гарыць жаданнем — у будатрад паедзе і, як заўсёды, не пашкадуе.

ВЫ ВЕДАЕЦЕ?

## ТАЯМНІЦЫ КАМЯНЁЎ

*А лепш усё ж такі трымаць камень за пазухай. На ўсялякі выпадак. Да такой незвычайнай высновы прыйшлі мы, наведаўшы рэспубліканскую выставу-продаж камянёў ва універсітэцкім музеі землязнаўства.*

*Сапраўды, вялікая таямніца — гэтыя камяні. Мякка ззяючы аметыст, напрыклад, абароніць вас ад злоўжывання алкаголем, калі, вядома, заўсёды трымаць яго пры сабе. Спяшайцеся — да 30 чэрвеня вы яшчэ паспееце набыць свой камень-талісман. Кошт розны: ад 5 рублёў за невялічкі аметыст да 440 рублёў за прываблівы самародак агата. Вядома, музейныя экспанаты не прадаюцца — толькі экземпляры асабістых калекцый, якіх на выставе багата.*

*Прыходзьце, і вы зачаруецеся прыгожым з фіялетавым адценнем чараітам, адзінае ў свеце месцанараджэнне якога — Якуція, а кошт аднаго кілаграма ўсяго толькі сыравіны, па словах Валянціны Лявонцьеўны Смольскай, супрацоўніцы музея,— шэсць тысяч рублёў.*



ПРА НАС ЯШЧЭ ПАЧУЕ СВЕТ (Чытайце 3-ю стар.)

ПАДПІСАНЫ ЗАГАД

## ЗАСЦЕРАГАЙЦЕСЯ ЧЫРВОНАГА ПЕЎНЯ!

Аддзелам аховы працы і тэхнікі бяспекі універсітэта былі праведзены праверкі выканання загаду «Аб стане пажарнай бяспекі ва універсітэце і мерах па яе паляпшэнню ў 1992 годзе».

Па стану на 7 красавіка ў Белдзяржуніверсітэце не выканана 50 мерапрыемстваў па пажарнай бяспецы, якія прапанаваны органамі Дзяржпажнагляду. Не ліквідаваны грубыя парушэнні, на якія ўжо звярталася ўвага раней, службамі галоўнага энергетыка і кіраўнікамі хімічнага і біялагічнага факультэта.

Вучэбныя карпусы хімічнага і біялагічнага факультэтаў, якія з'яўляюцца аб'ектамі асаблівай пажарнай небяспекі, не абсталяваны сістэмай абвяшчэння аб пажары і кнопкамі дыстанцыйнага пуску помпаў павысіцеляў. У навуковых і вучэбных лабараторыях тых жа факультэтаў, а таксама фізічнага, электраправодка і штэпсельныя злучэнні няспраўныя, але эксплуатуюцца. Ёсць шэраг парушэнняў «Правілаў прыладжвання электраўстановак». У службовых памяшканнях вучэбных і адміністрацыйных карпусоў работнікі па-ранейшаму выкарыстоўваюць электрабытавыя награвальныя прыборы, а гэта заўсёды патэнцыяльныя крыніцы для ўзнікнення пажару. І ёсць прыклад — пажар у кабінеце былога дырэктара падрыхтоўчых курсаў А. Паплыкі.

Работнікі сталярных майстэрняў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі універсітэта штодня пакідаюць у канцы работы тэхналагічнае і электратэхнічнае абсталяванне не ачышчаным ад вытворчага пылу. Памяшканні майстэрняў не ўбіраюцца ад стружкі, апілавак і іншых гаручых матэрыялаў. Не выконваюцца тут правілы пажарнай бяспекі і пры захаванні піламатэрыялаў.

У БДУ функцыянірує шэраг падраздзяленняў, якія не прыняты пастаянна дзеючай пажарна-тэхнічнай камісіяй. Напрыклад, вучэбна-вытворчыя майстэрні адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, навукова-даследчая лабараторыя МОРЭМ кафедры матэматычнага забеспячэння АСУ і камп'ютэрны клас кафедры атамнай фізікі.

Галоўны энергетык універсітэта І. В. Чачнёў ужо неаднаразова атрымліваў адміністрацыйныя і дысцыплінарныя спагнанні. Але яго служба па-ранейшаму не падае належнай увагі падтрымцы высокай пажарнай бяспекі пры эксплуатацыі электраўстановак і нездавальняюча выконвае заяўкі кіраўнікоў структурных падраздзяленняў па рамонту і мантажу электраправодкі, штэпсельных злучэнняў і інш.

Выклікае мноства нараканняў і дзейнасць пажарна-тэхнічнай камісіі універсітэта пад кіраўніцтвам М. М. Варанцова, якая не адпавядае патрабаванням «Палажэння аб пастаянна дзеючых пажарна-тэхнічных камісіях у навучальных установах».

У сувязі з такім становішчам рэктарам БДУ Ф. М. Капуцкім падпісаны загад «Аб грубых парушэннях пажарнай бяспекі на аб'ектах універсітэта і спагнаннях вінаўных». Згодна з ім, галоўны інжынер універсітэта А. К. Пекурын, як адказны за пажарную бяспеку збудаванняў БДУ, павінен да 15 мая распрацаваць план мерапрыемстваў па ліквідацыі адзначаных парушэнняў і пастаянна ажыццяўляць кантроль за станам пажарнай бяспекі аб'ектаў універсітэта і за работай пажарна-тэхнічнай камісіі.

Галоўнаму энергетыку І. В. Чачнёву належыць сіламі электраманцёраў праверыць стан электраўстановак у навукова-даследчых і вучэбных лабараторыях, майстэрнях і іншых падраздзяленнях і ліквідаваць недахоны.

ЯКАЯ БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ НАМ ПАТРЭБНА?

# «ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!»



*— Адкуль і калі ўзнік нацыянальны дэвіз «Жыве Беларусь!»? Што ўкладваецца ў гэта паняцце?*
*(З пытанняў студэнтаў II курса гістарычнага факультэта ў перапынку паміж лекцыямі па беларускай літаратуры.)*

Вокліч «Жыве Беларусь» віртае нас да пачатку стагоддзя, калі ўпершыню ў зборніку «Жалейка» з'явіўся верш Янкі Купалы «Гэта крык, што жыве Беларусь», які пісаўся на працягу 1905—07 гадоў. Гэта даволі аб'ёмны, сюжэтны верш баладнага зместу. Зусім невыпадкова ў зборы твораў Я. Купалы вокліч-верш стаіць поруч з вершам «А хто там ідзе?» — творам, які называлі нацыянальным гімнам Маладой Беларусі пачатку XX стагоддзя.

У вершы «Гэта крык, што жыве Беларусь» даецца разгорнутая панарама роднага краю, малююцца яскравыя яе праявы, падаюцца характэрныя прыкметы зямлі, дзе для паэта ўсё блізкае і дарагое. Тут вырысоўваюцца жывыя абрысы родных гоняў і палеткаў, вёсак з іх забудовамі. У вершы паказаны непаўторныя краявіды роднай старонкі.

Я тут бачу свой край,
поле, рэчку і бор,
Сваю матку-зямлю —
Беларусь.

У творы шмат канкрэтыкі, дэталяў побыту, шмат асабістага, вынашанага і выпакутаванага паэтам. Мастацкая рэч сапраўды эмацыянальная і настраёвая. Купала тут нібы ўзіраецца ў кожную дэталь побыту селяніна, у кожны падворак, у кожную саламяную хатку, пры гэтым услухваецца ў тое, што адчувае ягонае сэрца, як адгукаецца ў душы той непаўторны каларыт зямлі.

Тут жа неяк прывык
да ўсяго чалавек,
Прырос неяк, як корч
да зямлі!

Не хоча паэт гаварыць толькі пакуль што пра лёс людзей на гэтай прыгожай, але суровай і нялітасцівай для долі беларуса зямельцы («Долі іх надта ж я не люблю!..»). Але як не верыць у лепшы лёс народа і зямлі, як не сцвердзіць, што пакуль ёсць такі прыгожы і маляўнічы край, ён будзе жыць, будуць жыць і ягоныя людзі. Жыла, жыве і будзе жыць вечна Беларусь! Выпакутаванае і глыбокавынашанае пачуццё паэта вырываецца з грудзей палымяным патрыятычным крыкам-воклічам, крыкам-верай, крыкам-спагадай, але над усім крыкам-услаўленнем, вітаннем, прадчуваннем бясконцасці існавання, захапленнем, улюблёнасцю, упэўненасцю.

Ды і што гаварыць! —
дзе я толькі гляджу,
Бачу родненькі край,
сваю матку-зямлю;
. . . . . . . . . . .
А вот як не любіць
гэта поле і бор,
І зялёны садок,
і крыклівую гусь!
А што часам тут
страшна заенча віхор,—
Гэта енк, гэта крык,
што жыве Беларусь!

Вялікая ідэя жывучасці і несмяротнасці Беларусі і беларускай нацыі — роднай зямлі і яе народа — апаэтызавана Янкам Купалам таленавіта, захоплена, пераканаўча.

Твор звернуты да ўсіх і кожнага. Гэта твор-маналог, але і твор — паэтычная ода Радзіме, Бацькаўшчыне, Беларусі.

Верш нібы выдыхнуты з глыбінь народнага духу, ён народжаны ў душы паэта, ідзе ад сэрца, прасякнуты любоўю, напоўнены праўдай і ўдзячнасцю таленавітага і адданага сына, шчаслівага ад таго, што ён жыве на гэтай зямлі, вернага сына-патрыёта маці-Беларусі!

Гэты дэвіз стаў аксіёмай, з'явіўся нібы своеасаблівай формулай жыцця беларускага народа, наказам і сцвярджэннем адначасова.

Афарыстычны выраз быў падхоплены і развіты ў далейшым у творчасці іншых паэтаў: у вершы «Жыве Беларусь» Т. Чарнышэвіча, змешчаным у часопісе «Маладая Беларусь» у 1912 годзе, у празаічнай імпрэсіі пісьменніка, публіцыста, грамадскага дзеяча Фабіяна Шэнтыра «Жыве Беларусь», якая змешчана ў календары «Нашай Нівы» за 1915 год.

Жыццясцвярджальныя матывы з думкамі аб Беларусі гучаць і ў ласкава-памяркоўным, а разам і трагедыйна-прарочым, заклінальна-горкім, але ўпэўнена-сцвярджальным дэвізе выдаўцоў і творцаў «нашаніўскай» пары «Загляне сонца і ў наша аконца», пераклікаюцца гэтыя гучныя заявы, якія нерамяжоўваюцца з крыкам і болем, з адчаем ад занядбанасці і прыніжанасці краю і чалавека на ім у творах Цёткі, Я. Коласа, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны і іншых.

Доўгі час словы «Жыве Беларусь!» былі своеасаблівай формай нацыянальнага прывітання. Яно гучала так, як бы гучалі словы: «Слава Беларусі!»

У гэтым воклічу паядналася ўсё разам: гісторыя і сучаснасць, нашы нялёгкія шляхі да незалежнасці, пакручастыя дарогі да ўзыходжання і нацыянальнай славы, жаданне прабіцца да свету праз тоўшчу стагоддзяў, праз напластаванні заблуджэнняў і прымхаў, праз бар'еры бязвер'я і нацыянальнага нігілізму, праз туман падазронасці і адмаўлення, скрозь схаванае непрыняцце і адкрытую варожасць.

Няведанне каранёў з'яўлення звароту-дэвізу часам нараджае недавер ці выклікае нейкае незразумелае непрыняцце, а то і паталагічную непрыязнь і сёння. І вось тады ўжо ставіцца пад сумненне правамернасць самога ўжытку нацыянальнага дэвізу-выразу (ці воклічу, шырока распаўсюджанага ў якасці такога, прынамсі тады, калі плошча Незалежнасці аж гудзе-разлягаецца выдыхнутымі на апошнім дыханні сцвярджэннем-адказам, дыялогам прамоўцы і разбуджанага народу: «Жыве Беларусь!» — «Жыве!» (А мо бянтэжыць занадта ўпэўнены характар-тон гэтага «оптимистического заверения» — «Жыве Беларусь!», калі пра гэта можна яшчэ дзе-нідзе наткнуцца, як, напрыклад, у газеце «Мы и время» (матэрыял «Як... спадар Шушкевіч з Новым годам віншаваў»). Што б, здавалася, не падабаецца чалавеку ў выразе «Жыве Беларусь!»? Выраз як выраз. А ж не. Услед за непрыняццем у віншаванні выразу-запэўнівання «Жыве Беларусь!» у тым жа матэрыяле ідзе пякуча-гаркатлівы напамінак аб неверагодных ахвярах мінулай вайны, аб мільёнах беларусаў, знішчаных «немецкими оккупантами и местными предателями». І куды ўжо далей, як шалёны танец на магілах закатаваных, гучыць здзекліва-іранічнае ёрнічанне, што «последние тоже любили клич «Жыве Беларусь!» Иль может быть и это басня?» («Мы и время», 2.01.92).

Не, не басня. Кліч «Жыве Беларусь!» і адказ на яго «Жыве!» быў ва ўжытку Саюза Беларускай Моладзі (СБМ), арганізацыі, якая існавала «за немцамі». Але сколькі ўсё ж у нас часам ёсць імкнення — свядома ці несвядома — «зваліць» усё ў адну горбу, а то і затаптаць, расцерці, пазбыцца. Як нічога і не было. Каб і не было. Пазбыліся. Занядбалі. Адракліся. Прынцыпова не хацелі нешта прызнаваць ці нешта прымаць. А можа зноўку пачнем найперш пра каўбасу.

Але ж тут, менавіта ў гэтым ужо выпадку, зусім не патрэбны матэрыяльныя выдаткі, не трэба доўга і словы запамінаць, і валоданне мовай не патрабуецца невядома якое, патрэбны толькі нацыянальнае пачуццё і крыху беларускага вымаўлення. Ды тым часам нават рот не хочам расчыніць (не тое, што душу), каб штосьці добрае ды ласкавае сказаць, ды каб у руку, як кажуць, і ў той бок, дзе таго слова чакаюць, дзе яно патрэбнае, як хлеб, пра сваю ж маці-старонку, пра Беларусь-пакутніцу, гаротніцу, абыйдзеную ласкай і пашанотай. У крайнім выпадку адмахнемся, як ад гізлівай мухі, ад таго воклічу-крыку, як ад задухі ў спякотны прыпар пярэдыху. Ат, не да таго. А не дык сціснем зубы і зацята маўчым. Маўчым, браткі-беларусы. Хоць трашчу, але не дапушчу!

Давайце ўсё ж ачышчаць зерне ад шалупіння, вяртаць словам і выразам іх першапачатковы сэнс, і таму сёння нам трэба ісці ад купалаўскага, а значыць народнага, разумення неўміручасці нашага духу, купалаўскай трывожна-чуйнай заклапочанасці аб лёсе роднага краю, з упаўне зразумелымі і няпростымі, трывожнымі пытаннямі аб тым, дакуль можна трываць і што чакае нас наперадзе, з пакутлівым адвечным — «а што далей» ці «а што нам усім трэба рабіць».

Давайце вяртацца да купалаўскага «Жыве Беларусь!». Бо яна ўсё ж наперакор лёсу і абставінам жыве і будзе жыць!

Хацелася б, каб выраз-дэвіз той заставаўся ў нашым ужытку. Каб зусім справядліва і заслужана мог стаць (ды і даўно стаў ужо!) такім сапраўды нацыянальным дэвізам беларусаў і Беларусі. Бо не састрэў той дэвіз, не прыглушыўся той «енк-крык», не меней смыліць сэрца сёння ад заклапочанасці пра лёс Бацькаўшчыны і яе людзей. Добра было б, калі б той выраз-дэвіз з цягам часу стаў проста сімвалічна-рытуальным вітаннем ці неабходнасць у ім сама па сабе б адпала з-за яго ідавочнай неадпаведнасці рэальнасці, недарэчнасці, а ўспрымалася б усмешліва-паблажліва, як пажаданне «жыць» ці «сілы», «здароўя» чалавеку, моцнаму здароўем, асілку, волату, які і жартам і ўсур'ёз карчы варочае за двух. Але ж нам яшчэ трэба шмат зрабіць, каб жыла, існавала і напаўнялася новым зместам незалежная Беларусь, каб трывала станавілася на ногі і была, як пісаў той жа Купала, «сама сабе гаспадыня», што ніхто і слова не закіне, хоць яна і з мужыкоў. «А як выйшла ў людзі...»

Як мы маглі пераканацца, у выразе «Жыве Беларусь» гучаць найперш апаэтызаваныя Купалам і іншымі творцамі, выдатнымі сынамі Маці-зямлі, слава і гонар Беларусі, яе мінулае і сённяшняе, яе пакутніцкі, але няскораны і гераічны шлях да незалежнасці і самастойнасці, нязломная і глыбокая вера ў лепшае будучае, трывалае захапленне жыццём, Праўдай, Харастовом, Сонцам, Зямлёю, рэчамі вечнымі і вызначальнымі, услаўленне зямлі і чалавека на ёй, услаўленне і вітанне Новага Дню, Новага Часу, Новага Жыцця.

Прывітаем жа адзін другога «Жыве Беларусь!». І адкажам: «Жыве!»

**Уладзімір НАВУМОВІЧ,**
**кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры.**

ЛЮСТЭРКА

# БІЗНЕС У КАРОТКІХ ШТОНІКАХ

**ПА ЗАКАЗУ ВЫДАВЕЦКА-ПАЛІГРАФІЧНАЙ КАМПАНІІ «ЭРИДАН» СУПРАЦОЎНІКІ САЦЫЯЛАГІЧНАГА НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАГА ЦЭНТРА ПАСПРАБАВАЛІ СТВАРЫЦЬ САЦЫЯЛЬНЫ ПАТРЭТ БЕЛАРУСКАГА ПРАДПРЫМАЛЬНІКА.**

Якія ў яго мэты дзелавой актыўнасці? Як ставіцца ён да палітыкі? Што лічыць за галоўнае? З дапамогай вядучага навуковага супрацоўніка цэнтра **Лідзіі Георгіеўны НОВІКАВАЙ паспрабуем адказаць на гэтыя пытанні.**

Было апытана каля 300 прадпрымальнікаў Мінска рознага ўзросту, якія прадстаўляюць прадпрыемствы розных відаў уласнасці — кааператывы, акцыянерныя, малыя, арэндныя, сумесныя прадпрыемствы.

Як вылучыць прадпрымальніка з агульнага натоўпу? Першым чынам арыентуйцеся на маладых мужчын (яны складаюць значна большую частку дзелавых людзей у нас), 70 працэнтаў з іх маюць вышэйшую адукацыю, а 7 працэнтаў — нават вучоныя ступені.

Прадпрымальнікі — сапраўды новы, аб'ектыўна народжаны часам пласт грамадства. І, пэўна, яны не зваліліся да нас з неба. Гэта людзі, якія заўсёды жылі разам з намі. У «даперастроечны» перыяд — 20 працэнтаў з іх набывалі вопыт дзейнасці на глебе спекуляцыі. У асноўным жа — гэта малаграшовыя слаі тэхнічнай інтэлігенцыі, былыя кіраўнікі розных узроўняў.

Маральна ўсё тое, што эканамічна эфектыўна. Але цікава, што сярод прадстаўнікоў класа больш адухоўленыя, калі магчыма такое акрэсленне,— навічкі ў бізнесе.

Навічкі, наогул,— своеасаблівае згуртаванне. Яны прыйшлі ў бізнес амаль безабаронныя з невялікім першапачатковым капіталам. Таму калі ў іх з'яўляюцца вольныя грошы, яны не імкнуцца ўкладваць іх у справу, каб атрымаць дадатковы даход, а марнуюць іх на задавальненне сваіх жаданняў.

Навічкі імкнуцца знайсці блізкіх па духу людзей і амаль не цікавяцца стварэннем высокай дзелавой рэпутацыі.

Вядома, што ўсе цяжкасці прадпрымальніцкай дзейнасці звязваюцца з непаслядоўнай эканамічнай палітыкай. І калі ў хуткім часе эканамічная палітыка ўрада ў адносінах да прадпрымальнікаў не зменіцца да лепшага, то вопытныя вернуцца ў «чорны бізнес», а навічкі ж у асноўным імкнуцца за гэты спрыяльны адносна час зарабіць больш грошай, каб жыць бязбедна, а потым — хоць трава не расці.

Адсюль зразумела, чаму каля 40 працэнтаў нашых бізнесменаў займаюцца гандлёва-пасрэдніцкай дзейнасцю.

Прадпрымальнікі, у большасці сваёй, абстрагавацца на палітыку не жадаюць, хоць пераканаы ў тым, што «сваіх» людзей у органах улады трэба мець абавязкова, каб было на каго рабіць уплыў.

Беларускі прадпрымальнік рэдка размаўляе з Богам (толькі чацвёртая частка апытаных), амаль што ніколі на яго не спадзяецца, а імкнецца самастойна дасягнуць усяго магчымага дзеля набліжэння галоўнай мэты.

АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

# «НЕ РАССТАНУСЬ С КОМСОМОЛОМ, БУДУ ВЕЧНО.... В СССР»

Тое, пра што так доўга марылі прыхільнікі ленінскага камсамолу былой магутнай дзяржавы, нарэшце здзейснілася: у падмаскоўным горадзе Мендзялеева адбыўся аднаўленчы з'езд ВЛКСМ, які яшчэ не так даўно фактычна наказаў доўга жыць.

Сэнс гэтай падзеі асабіста я сфармуляваў бы наступным чынам: «Не расстанусь с комсомолом, буду вечно в СССР».

Магу пагадзіцца, што некаторым былым адказным работнікам няпроста забыць мінулае. Па сутнасці, сёння яны засталіся па-за гульнёй. Але ж гэта, браткі, не падстава для дзеянняў накшталт «што хачу, тое і варачу» без уліку жыццёвых рэалій.

У свой час я не меў нічога супраць стварэння ЛКБ і адраджэння ЛКСМБ. Але растлумачце мне: навошта сёння злучаць тое, што немагчыма. Можна адрадзіць камсамол у Расіі, на Украіне, Беларусі, але ўтопіяй выглядае спроба іх зліцця ў адзіную, УСЕСАЮЗНУЮ грамадска-палітычную арганізацыю. Хаця б таму, што час Саюза ўжо даўно мінуў.

Давайце зірнем на гэтую праблему з юрыдычнага пункту гледжання. Па-першае, ВЛКСМ не зможа атрымаць статус юрыдычнай асобы, г. зн. атрымаць афіцыйную рэгістрацыю, бо ніводная рэспубліка экс-Саюза не мае такіх паўнамоцтваў. Па-другое, некаторыя цяпер ужо незалежныя рэспублікі прынялі закон, згодна з якім партыі і грамадска-палітычныя арганізацыі і рухі не маюць права дзейнічаць на іх тэрыторыі.

Вось і выходзіць, што быць ВЛКСМ па-за законам. Але гэта наўрад ці бянтэжыць тых, хто заварыў усю гэтую з'ездаўскую кашу. Знаходзячыся на паўлегальным становішчы, яны маюць намер паказацца ў народзе пакутнікамі і такім чынам здабыць сабе папулярнасць. Але ж не пройдзе такі ход — час цяпер іншы.

**А. ЮРЫН.**

СЛУЖБА 03

# ВОЧЫ — ЛЮСТЭРКА ЗДАРОЎЯ

Зрок дае людзям амаль 90 працэнтаў інфармацыі, якая ўспрымаецца ад знешняга свету. Захаванне яго неабходна для ўсіх бакоў чалавечай дзейнасці, ці то вучоба, ці работа або адпачынак.

Прыгожыя, выразныя, жывыя, бліскучыя вочы — каму не хочацца, каб яны так выглядалі? Аказваецца, гэта залежыць, акрамя іншых фактараў, і ад якасці ежы, у прыватнасці, ад наяўнасці ў ёй вельмі каштоўных вітамінаў $A^1$, $B^2$, С.

Прыпухласць павек раніцай пасля сну можа сведчыць аб недахопе ў рацыёне харчавання вітаміну А. Рэкамендуецца ўжываць больш пятрушкі, шпінату, морквы — яны не толькі забяспечаць арганізм вітамінам А, але і палепшаць зрок.

Каб пазбавіцца ад сіні пад вачыма, карысна ўвесці ў рацыён зялёныя салаты. Яны багатыя разнастайнымі вітамінамі.

Наяўнасць вітаміну $B^2$ вызначае жывасць і бляск вачэй. Крыніцай яго служаць сухія піўныя дрожджы і зародкі пшаніцы, печань, яйкі, малако...

Што датычыцца вітаміну $C^1$, то ім багатая амаль уся садавіна і гароднiна: капуста, зялёны лук, ягады, апельсіны, лімоны, грэйпфруты. Дзякуючы вітаміну С, захоўваецца рухавасць мышцаў вачэй. Прычынай стомленага позірку нярэдка можа быць лішак таксінаў у арганізме, вывядзенню якіх са дзейнічаюць мінеральныя воды.

Вочы, як люстэрка, адлюстроўваюць усе трывогі пражытага дня, выдаюць зрокавае і нервовае напружанне. Паспрабуйце зняць стомленасць. Закрыйце вочы і сярэднімі пальцамі абедзвюх рук крыху памасіруйце іх кругавымі рухамі, пачынаючы ад асновы носа, потым пад лініяй броваў да знешняга краю вачэй і зноў вяртаючыся да носа. На 1-2 хвіліны пакладзіце далоні на закрытыя вочы.

Вядома, што мышцы вачэй вельмі рухавыя і знаходзяцца ў пастаянным руху. Спецыяльная гімнастыка аказвае дабратворны ўплыў на рухавыя рэакцыі вачэй.

Карысныя для зроку і рэгулярныя фізічныя практыкаванні. Самы лепшы адпачынак пасля зрокавай работы — актыўны, у руху. Некалькі гімнастычных практыкаванняў ці нават хадзьба па пакоі хутка знізяць стомленасць, дае адпачынак вачам, аднаўляе працаздольнасць.

В. КАНДРАЦЬЕВА,
урач-афтальмолаг.

# Універсітэт чалавека

Як бы ні называлі мы краіну — СССР, ССД, СНД — яе жыццяздольнасць будзе залежыць не ад перастаноўкі літараў, а ад кампетэнтнасці кіруючых кадраў, высокага прафесіяналізму спецыялістаў усіх галінаў народнай гаспадаркі. Ідэя кардынальных змен сістэмы народнай адукацыі доўгі час ужо вітае ў сацыяльна-наэлектрызаваным паветры. Некаторыя вядомыя беларускія вучоныя бачаць панацэю ў стварэнні ў рэспубліцы Універсітэта Чалавека — комплекса сярэдніх, спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў розных тыпаў, у якіх павінен быць забяспечаны высоік сучасны ўзровень навучання на прынцыпах гуманітарызацыі навучальнага працэсу. Але ж ва ўмовах рынку ўсё больш адчуваецца патрэба ў спецыялістах, здольных эфектыўна працаваць у новых эканамічных умовах. Каласальныя выдаткі народнай гаспадаркі ад нізкага кваліфікацыйнага ўзроўню рабочых, некампетэнтнасці кіраўнікоў — вельмі вялікая раскоша для кволай эканомікі. Не ў стане пазбавіць нас гэтай праблемы ні традыцыйная сістэма адукацыі, ні розныя курсы і камерцыйныя школы, якія часта пакутуюць на тыя ж хваробы.

Маючы магчымасць уплываць на рашэнні Міністэрства адукацыі, мы з задавальненнем адстойвалі б сваю канцэпцыю. Галоўнае адрозненне прапануемай сістэмы ў тым, што заказчык можа сам дыктаваць умовы і профіль падрыхтоўкі спецыялістаў. Базу сістэмы будуць складаць камп'ютэрныя банкі дадзеных: банк методык навучання, банк педагагічных кадраў, банк заказчыкаў і банк падрыхтаваных спецыялістаў.

У аснову вучэбнага працэсу пакладзены прынцып камбінавання спосабаў выкладання. Маецца на ўвазе таксама стварэнне сеткі базавых прадпрыемстваў (у тым ліку і за мяжой), дзе, па неабходнасці, навучэнцы маглі б праходзіць практыку ў якасці штатных супрацоўнікаў (па жаданню заказчыкаў практыка можа праходзіць і на базе самога заказчыка, што, безумоўна, лепш). Такім чынам, з'яўляецца магчымасць хуткай пераарыентацыі структуры навучання адпаведна патрабаванням заказчыка, якія мяняюцца.

У рамках прапануемай сістэмы можна ажыццявіць падрыхтоўку спецыялістаў як у групавым, так і ў індывідуальным парадку. У адпаведнасці з жаданнем заказчыка можа праводзіцца падрыхтоўка спецыялістаў з ліку рэкамендаваных ці кандыдатаў з ліку свабодных канкурсантаў, якія прайшлі тэст на прафесійную прыгоднасць.

Укараненне прапануемай сістэмы дазволіць:

— сабраць разам вядомыя айчынныя і замежныя перадавыя методыкі навучання, максімальна выкарыстаць іх патэнцыял;

— аператыўна рыхтаваць спецыялістаў па рабоце з гэтымі методыкамі;

— стварыць зацікаўленасць у распрацоўцы новых метадаў навучання;

— аператыўна ствараць спецыялізаваныя праграмы навучання і падбіраць кадры для іх рэалізацыі;

— стварыць творчую і матэрыяльную зацікаўленасць выкладчыцкага саставу ў якаснай падрыхтоўцы спецыялістаў і ва ўдасканаленні сваёй работы;

— стварыць своеасаблівую педагагічную біржу працы.

Сістэма можа суіснаваць з традыцыйнай сістэмай адукацыі, быць рэалізаванай адной установай, укаранёнай за адносна кароткі тэрмін.

Важнейшым вынікам укаранення сістэмы стане рэзкае павышэнне якаснага ўзроўню навучання, стварэнне перадумоў для пастаяннага ўдасканалення вучэбнага працэсу і падняцця прэстыжу адукацыі.

Прапануемая сістэма павінна быць крыніцай высокакваліфікаваных рэсурсаў для народнай гаспадаркі краіны, тым самым будзе забяспечаны інфармацыйны, тэхналагічны рывок, які закладзе асновы нашага эканамічнага суверэнітэту.

Ігар БАБРОЎСКІ,
Аляксандр ГАНУШ.



# ПАРЫЖ УБАЧЫЦЬ НАШЫХ ДЗЯЎЧАТ!

**СЭРЦЫ МАЛАДЫХ МІНЧАНАК УСКАЛЫХНУЛА АБ'ЯВА: ШУКАЮЦЬ ПРЫГОЖЫХ ДЗЯЎЧАТ! ПЕРАМОЖЦЫ ЕДУЦЬ У ПАРЫЖ, АДТУЛЬ — ПРАМАЯ ДАРОГА Ў ЛОС-АНЖЭЛЕС! І МІНСКІ ЦЭНТР МОДЫ, ШТО НА ПРАСПЕКЦЕ МАШЭРАВА, АКУПІРАВАЛІ СОТНІ ДЗЯЎЧАТ...**

Два дні доўжыўся конкурс-адбор. журы працавала напружана. Я заўважыў толькі аднаго чалавека, які не хваляваўся: сталых гадоў мужчына ціха драмаў амаль у цэнтры залы, абыякавы да прыгожых твараў, кароткіх спадніц і доўгіх ног.

Калі старшыня журы, чароўная француженка Дамінік Кафін, аб'явіла прозвішчы дзяўчат-пераможцаў, у некаторых з тых, хто не ўвайшоў у гэтую тройку, заблішчэлі на вачах слёзы. А віншаванні прымалі мінчанкі Марыя Зяленская, Наталля Мазала і Кацярына Чайка.

Тэкст і фота
С. ВАСІЛЬЕВА.

ЦІ ТАК У НАС?

# ЧЫСТА АНГЛІЙСКІ ІНТЭРНАТ

...Адбывалася гэта ў Лестарскім універсітэце. Мы стаялі ля ўвахода ў двухпавярховы катэдж, размешчаны ў паркавай зоне, і я задаў Сцюарду Парку — студэнту-старшакурсніку, сваё самае каверзнае пытанне: «Ну, добра... А калі ты пасля дванаццаці ночы, калі ўваход замкнуты, вядзеш у свой пакой дзяўчыну? Тады — як?...»

На што Сцюард — у гэтым інтэрнаце ён як бы ўзначальвае студэнцкі савет — моўчкі дастаў з кішэні курткі маленькі ключык — ад уваходных дзвярэй. «У кожнага ёсць такі, — сказаў Сцюард, — і потым: каго павінны цікавіць мае асабістыя справы?»

Мы ўвайшлі ў хол аднаго (па маёй просьбе — самага тыповага) з інтэрнатаў Лестарскага універсітэта. На першым паверсе жывуць хлопцы — запасны выхад з кожнага пакоя прама на спартыўныя поплавы. На другім — дзяўчаты. У студсавеце лічаць — так больш бяспечна.

Рычард Палмер-Джонс — студэнт-палітолаг, запрашае нас у свой пакой, частуе гарбатай па-англійску — з малаком. У пакоі ён жыве адзін, але ў інтэрнаце ёсць і «даблрум» — пакоі для дваіх. Гэта каму як падабаецца.

За аднамесны пакой Рычард плаціць 1600 фунтаў у год. Па нашых мерках, гэта многа. Але раскашэльваецца не ён сам і нават не яго бацькі, а муніцыпальныя ўлады, якія накіравалі хлопца ў Лестарскі універсітэт.

Пакой на дваіх будзе каштаваць амаль на 200 фунтаў стэрлінгаў менш. Аплата робіцца па сезонах: асенняму, веснавому і летняму. Летам студэнт плаціць на 100 фунтаў менш, чым восенню і вясной. Аплата ўключае карыстанне ўсімі бытавымі паслугамі, а таксама двухразовае ў звычайныя і трохразовае па суботах і нядзелях харчаванне. Паколькі мы былі ў Лестарскім універсітэце ў суботу, я апішу вам толькі дэсерт, які падалі студэнтам: традыцыйны для англічан яблычны пудынг, вінаград, бананы і грушы. Жадаючыя замест пудынга маглі ўзяць марожанае.

Чысціню і парадак у сталовай, інтэрнатах падтрымлівае абслуга. Як правіла, гэта жанчыны пажылога ўзросту, у якіх са студэнтамі складваюцца мацярынскія адносіны.

Мае новыя знаёмыя збіраліся правесці «знатны вечарок», як сказаў Рычард, у адным з лестарскіх бараў. «Ну, а як жа інструкцыя рэктара?» — спытаўся я, намякаючы на рэкамендацыю «Не паркавацца ў горадзе». «На тое яны і існуюць — інструкцыі, каб іх парушаць», — адказалі брытанскія студэнты і забразгалі дзверцамі свайго старэнькага, аднак, магутна ўзяўшага з месца «Форда».

А. КУПРЫЯНАЎ.
«Комсомольская правда».

ЯК ВЫЖЫЦЬ?

# ЦЯЖКА ДАВАЦЬ ПАРАДЫ ЧАЛАВЕКУ, ЯКІ АПЫНУЎСЯ ПА-ЗА СПРАВАЙ. ТЫМ БОЛЬШ УЛІЧЫЦЕ НАШЫ РЭКАМЕНДАЦЫІ

Часцей за ўсё нечаканае беспрацоўе ўяўляе сабой хутчэй эмацыянальную і фізічную праблему, чым проста страту працоўнага месца. Як сведчаць многія даследванні, беспрацоўе нараджае мноства асабістых, сямейных і сацыяльных праблем: ад дэпрэсіі да жорсткіх адносін да дзяцей і насілля.

Ад беспрацоўя пакутуюць не толькі тыя, хто непасрэдна страціў работу. Многія жывуць у напружанай боязі, што вось-вось апынуцца ў чарзе за бясплатнай пахлёбкай. Аднак спецыялісты па псіхалагічных следствах беспрацоўя лічаць, што большасць з тых, хто застаўся па-за справай, і іх сем'і маглі б адчувальна зменшыць урон, нанесены вымушаным гультайствам, як і яго адмоўнае ўздзеянне на здароўе і трываласць сям'і.

Доктар М. Харві Брэнер, які з'яўляецца сацыёлагам у Інстытуце Джона Хопкінса па пытаннях аховы здароўя, устанавіў, што ў час і пасля эканамічных спадаў 70-х і 80-х гадоў адзначалася адчувальнае павелічэнне смяротнасці ад сардэчных захворванняў і прыступаў цыроза пячонкі, самагубстваў і забойстваў сярод насельніцтва. Узрастала таксама і колькасць пацыентаў у псіхіятрычных лячэбніцах, колькасць арыштаў, выпадкаў махлярства.

У другім даследванні, што праводзілася сярод рабочых аўтазавода, якія нядаўна страцілі работу ці жывуць пад пагрозай скарачэння, беспрацоўе звязана з больш частымі канфліктамі ў сям'і, напружанасцю і стрэсам. Беспрацоўныя часцей сварацца з жонкамі і з дзецьмі.

Некаторыя пераносяць беспрацоўе лягчэй за іншых і таму, па меркаванню псіхіятра з Паўночна-Заходняга інстытута ў Форт Вашынгтоне Джэйкоба Трахтэнберга, хутчэй развітваюцца з бояззю. Ён і іншыя спецыялісты заклікаюць тых, хто страціў работу, адразу ж папярэдзіць дэпрэсію і з'яўленне пачуцця непатрэбнасці. Вось некаторыя парады.

**Не абвінавачвайце сябе ў скарачэннях, у выніку якіх вы страцілі працоўнае месца.**

**Паспрабуйце пераўтварыць сваю незадаволенасць у стымул для пошукаў новай работы.**

**Абмяркоўвайце свае праблемы з сям'ёй і сябрамі. Дайце дзецям зразумець, што яны невінаватыя ў гэтым няшчасці. Падзеленае з іншымі гора не аддае горыччу.**

**Прадумайце канкрэтны план пошукаў работы. Падрыхтуйце рэзюме, чытайце рэкламныя прапановы рабочых месцаў, імкніцеся, каб як мага больш людзей ведалі, якая менавіта работа вам патрэбна.**

**Калі няма магчымасці ўладкавацца па ранейшай спецыяльнасці, падумайце аб курсах перападрыхтоўкі. Ацаніце свае магчымасці, свой патэнцыял і інтарэсы і скарыстайце сітуацыю, каб выбраць новы напрамак прафесійнай дзейнасці.**

**Імкніцеся ў максімальнай ступені захаваць звычкі свайго ранейшага жыцця. Працягвайце заняткі, якія прыносяць вам задавальненне, не губляйце сувязі з сябрамі.**

**Адшуквайце пазітыўныя спосабы выказвання сваіх адмоўных эмоцый: напрыклад, фізічныя практыкаванні, што можа таксама дапамагчы захаваць неабходную фізічную і маральную падрыхтоўку.**

**Вазьміце работу на палову стаўкі. Ці працуйце дома, пераўтварыўшы сваё хобі ў крыніцу даходаў.**

«НЬЮ ЙОРК ТАЙМС».

# ДЛЯ ЦЯБЕ

САЛОН ПРЫГАЖОСЦІ

## КАЗАЧНЫ СВЕТ ВОДАРАЎ

Што робіць жанчыну чароўнай? Дасканалы макіяж і водар, здольны ап'яніць.

Жанчына і духі — тэма заўсёды новая. Сёння чаруючых водараў столькі, што мы не можам лічыць, быццам ведаем пра іх усё.

Зімнія і летнія водары істотна адрозніваюцца. Летам, у гарачыя і вільготныя дні, калі ўзмацняюцца натуральныя пахі цела, лепш карыстацца лёгкімі духамі са свежым водарам зеляніны і кветак. Зімой жа, пры сухім і халодным паветры, уласныя пахі зводзяцца да мінімуму, таму гэты час падыходзіць для моцных духоў, сезон ружовага масла і ўсходніх водараў.

Для сучаснай жанчыны недастаткова нанесці кропелькі духоў толькі за мочкамі вушэй. Пасля душу ёй спатрэбіцца туалетная вада (толькі на сухую скуру!). Калі вы асцярожная ў выкарыстанні водараў жанчына, нанасіце духі ў пэўных месцах, там, дзе адчуваецца біццё пульсу: на ўнутраным баку запясця, на локцевым згібе, скронях, на мочках і падкаленных ямках.

ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО...

першы штучны водар з'явіўся ў продажы ў 1924 годзе? Гэта былі духі «Шанель № 5»;

водары праяўляюцца на кожным тыпе скуры пароэнаму? Тлустая скура ўспрымае іх хутчэй, чым сухая;

духі трэба захоўваць у цёмным месцы? Пад уздзеяннем яскравага святла і сонечных промняў яны раскладаюцца і набываюць непрыемны пах;

існуюць маркі туалетнай вады, якія аднолькава падыходзяць і мужчынам, і жанчынам?

водары добра трымаюцца на валасах? Пасля таго як вы памылі і пасушылі валасы, падушыце іх:

некаторыя расліны, напрыклад, герань, размарын, лаўр, маюць дабратворны ўплыў на нервовую сістэму?

Грас, маленькі горад на поўдні Францыі, называюць «еўрапейскай кухняй водараў»? Грас — сусветна вядомы цэнтр вытворчасці натуральных і змяшаных парфюмерных эсенцый;

падбіраючы «свой» водар, вы павінны аддаць перавагу таму, які адпавядае вашаму характару ці тэмпераменту? Пры гэтым ніякай ролі не адыгрывае, бялявая вы ці чарнявая.

## ХІТРЫКІ НАШЫХ БАБУЛЬ

Агурэчныя маскі — цудоўны касметычны сродак. Кавалачак агурка таўшчынёй 3-4 см здрабніце і змяшайце з белай глінай. З дапамогай пэндзліка нанясіце раўнамерна масу на твар і праз 15 хвілін змойце вадой. Скура стане ружовай і свежай.

* * *

Для дагляду за скурай добра падыходзіць мінеральная вада: намачыце ватны тампон і на працягу 10 хвілін мяккімі рухамі праціпрайце твар. Гэта асвяжае скуру і робіць яе пругкай.

* * *

З лупіны нявыціснутага лімона можна прыгатаваць экстракт для ван. Лупіну заліце шклянкай вады і настойвайце два дні.

Ванна, куды дададзена сталовая лыжка мёду, робіць скуру шаўкавістай. Акрамя таго, такая ванна расслабляе, здымае нервовае напружанне і выклікае адчуванне прыемнай стомы.

* * *

Свежыя ці высушаныя лісты мяты выкарыстоўваюцца не толькі для прыгатавання гарбаты. Як дабаўка ў паравую ванначку яны аказваюць прафілактычнае і лячэбнае ўздзеянне пры любых прастудных захворваннях, бо аблягчаюць дыханне. Гэта працэдура дапамагае і пры галаўным болі.

Часопіс «БУРДА».

## КАРЫСНА ЧАСАМ ПАСВАРЫЦЦА

Вез канфліктаў нельга ўявіць сямейных будняў, і наўрад ці знойдуцца муж і жонка, якія здолелі пазбегнуць рознагалоссяў. На жаль, часам страсці распальваюцца так моцна, што спакойнае высвятленне праблемы становіцца немагчымым. Напэўна, наступныя парады дапамогуць вам у такіх сітуацыях.

Амаль усе канфлікты можна падзяліць на тры групы: КЛАСІЧНЫ КАНФЛІКТ З-ЗА ДРОБЯЗІ, які заўсёды ўзнікае спантанна і перажываецца больш ці менш імпульсіўна. Напрыклад, занадта гучная музыка ці занадта доўгая тэлефонная размова.

ВІДАВОЧНЫ КАНФЛІКТ З-ЗА ДРОБЯЗІ. за якім на самой справе часцей за ўсё падсвядома хаваецца агрэсіўнасць і барацьба за ўладу: гучна зачыняюцца дзверы, каб перашкодзіць партнёру, дэманстратыўна пераключаецца тэлевізійная праграма.

ПРЫНЦЫПОВЫЯ КАНФЛІКТЫ выклікаюцца разыходжаннем ў меркаваннях па важных пытаннях, напрыклад, аб буйной пакупцы ці выхаванні дзіцяці.

Як правіла, чым часцей пэўныя канфлікты аднаўляюцца тым вышэй эмацыянальная напружанасць, тым часцей за гэтым хаваецца так званая «вайна пазіцый».

Вырашыце для сябе, ЧАГО ВЫ ХОЧАЦЕ.

Любыя канфлікты партнёраў вырашальныя, калі ёсць агульная зацікаўленасць у высвятленні пунктаў гледжання.

Адкажыце на пытанні невялічкага тэсту аб тым, як вы паводзілі сябе ў апошняй сварцы;

ці былі вы раздражнёныя?

ці многа было ў вашых словах папрокаў?

ці адчувалі вы сябе правым(ай) з самага пачатку?

ці пералічвалі вы адмоўныя якасці партнёра?

ці спрачаліся з ім?

*І яшчэ некалькі парад.*

*Адкладзіце крытычны разбор, калі кіпіце ад гневу.*

*Вызначце дакладны час для размовы і загадзя сфармулюйце праблему.*

*Вельмі важна не адхіляцца ад тэмы! І не нагадвайце старых грахоў!*

*У час сваркі стаўце ў цэнтр саму праблему, а не пераходзьце на асобу.*

*Дайце выказацца партнёру.*

*Паспрабуйце стаць на месца партнёра і знайсці разумны кампраміс.*

*Нягледзячы на ўзаемнае жаданне і добрыя намеры, не ўсе праблемы партнёры здольныя вырашыць самастойна. Часцяком дапамагчы могуць нейтральны субяседнік, знаёмы ці сябар, а таксама кансультант па сямейных пытаннях. Дарэчы, зварот да яго не павінен разглядацца як аб'ява капітуляцыі. Наадварот, менавіта ў гэтым рэальны шанц знайсці найлепшае выйсце.*



ПСІХАЛАГІЧНЫ ПРАКТЫКУМ

## ПРАСВЯТЛЕННЕ — ГЭТА ДЛЯ ВАС

**У нумары за 19 сакавіка мы пачалі друкаваць для вас урыўкі з кнігі Тадэвуша Голаса «Кіраўніцтва па прасвятленню для лянівых». Сёння — працяг. Нагадваем: з дапамогай гэтых рэкамендацый вы маеце шанц пачаць новае жыццё! Такім чынам...**

Няма ніякіх папярэдніх умоў для дасягнення прасвятлення. Увесь магчымы вопыт ужо знаходзіцца ўнутры вас. Вы можаце адчыніцца яму ў любы момант, хутчэй, чым імгненна, проста знаходзячыся ў ім.

Але не спяшайцеся. Поўнае расшырэнне заўсёды даступнае, па-за часам, унутры і паза вамі. Адчыняць сваю свядомасць належыць з той хуткасцю, якая здаецца вам зручнай і бяспечнай. Калі вы пачалі надта хутка — ідзіце больш павольна. МЫ ЎЖО ДОМА. МЫ ЎСЕ НАЛЕЖЫМ СУСВЕТУ.

Нішто не заступае наш шлях, але звычайна мы трапляем у эмацыянальныя цыклы: пасля кожнай успышкі эйфарычнай рэалізацыі вы можаце сутыкнуцца з новым негатыўным вопытам, з наступнай сітуацыяй, якую вам трэба навучыцца любіць. Але чым вышэй вы паднімецеся, тым лягчэй гэта атрымліваецца.

Быць прасторай значыць быць гатовым да поўнага ўсведамлення ўсяго, што можна ўспрыняць.

...працэс прасвятлення заключаецца ў расшырэнні нашага ўспрымання ІНШЫХ істот да тае пары, пакуль усё не будзе ўспрымацца намі як узаемадзеянні жывога.

ПРАСВЯТЛЕННЕ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА МЕНАВІТА Ў САМІМ ПРАЦЭСЕ РАСШЫРЭННЯ, А НЕ Ў ПАПАДАННІ Ў НОВЫЯ МЕЖЫ.

...«пасля» прасвятлення мы не абавязаны быць тым ці іншым, бо нашыя сэрцы і ўсведамленні становяцца суцэльнымі. Гэта значыць, што мы павінны хацець успрыняць і ўмясціць у сябе тое, што з'яўляецца «іншым» у адносінах да любой абмежаванай ідэі. Калі мы падкрэсліваем пазітыўнае, мы ў той жа час ствараем негатыўнае. Калі мы выбіраем у якасці ідэала веды, нам даводзіцца мець справу з невуцтвам... Калі мы выбіраем у якасці ідэала святасць, нам даводзіцца жыць сярод грэху і ўсведамляць сваю адказнасць за яго стварэнне. Аднак пастаянная адчыненасць і несупраціўленне такім станам вызваляе нас ад абавязку затрымлівацца ў іх. Калі мы дапусцім, што агіднасць заўсёды прысутнічае ў нас, тады мы вольны ствараць прыгажосць. Калі мы ведаем, што ў нас заўсёды ёсць глупства, мы вольныя засяродзіцца на розуме.

Любоў з'яўляецца вышэйшым і самым святым дзеяннем, бо яна заўсёды змяшчае ў сабе тое, што не ёсць любоў, яна заўсёды імкнецца ахапіць тое, што не любіць.

Па меры росту вібрацыйнага ўзроўню вы можаце сутыкнуцца з тым відам вопыту, ад якога вы адмовіліся ў мінулым, ці можаце трапіць у ІНШАЕ ў адносінах да таго вопыту, за які вы ў сапраўдны момант чапляецеся. Калі вы пры гэтым паспрабуеце закрыць свядомасць, то трапіце назад на ўзровень больш нізкіх вібрацый. Але калі вы паглядзіце спакойна на нежаданыя падзеі, унутрана іх успрымеце і ПАЛЮБІЦЕ СЯБЕ ЗА ТОЕ, ШТО ЯНЫ ВАМ НЕ ПАДАБАЮЦЦА, рух уверх будзе працягвацца.

Калі вы навучыцеся ўспрымаць і любіць кожную непрыемную падзею, вы пачнеце разумець, што нічога з непакоячага вас зла не знікне са свету. Але вашы імпульсіўныя пачуцці нуды і бездапаможнасці пакінуць вас, вы навучыцеся пракладваць шлях, абыходзячы непрыемныя вібрацыі ці праходзячы праз іх так, што яны не прынясуць вам шкоды, і з цягам часу вы наогул перастанеце сустракаць іх. Вы ўбачыце, як можна змяняць эмоцыі і ўспрыманні, проста ўсведаміўшы іх сувязь з вашым узроўнем свядомасці.

Напрыклад, калі вы губляеце пачуццё глыбокага кахання да каго-небудзь, вы зможаце ўсведаміць гэта як знікненне з адной прасторы з гэтым чалавекам, бо цяпер вы зноў вібрыруеце на больш нізкім вібрацыйным узроўні. Калі вы зразумееце гэта і тое, што нізкі ўзровень можа знікнуць з такой жа лёгкасцю, як прыйшоў, менш верагодна, што вы з-за гэтага кінецеся ў спрэчкі і высвятленне адносін. Вы проста расслабіцеся і ўбачыце, як ён знікне.

Мы імкнёмся вярнуцца на той вібрацыйны ўзровень, дзе мы адчуваем сябе стабільнымі, на такі ўзровень, у якім «можна жыць». Менавіта гэты ўзровень, на якім нас не непакояць вібрацыі іншых істот. А гэта можа быць зроблена толькі ў стане свядомасці, пазбаўленым супраціўлення, пастаянна распаўсюджваючы любоў.

ТОЕ, ШТО АДБЫВАЕЦЦА, НЕ ТАК ВАЖНА: ВАЖНА ТОЕ, ЯК ВЫ НА ГЭТА РЭАГУЕЦЕ. Вось правільны спосаб адносін да любой мэты: добра, калі гэта адбудзецца; добра, калі не. Вы не будзеце ўтрымліваць якое-небудзь цудоўнае адчуванне, бо любоў зробіць наступнае настолькі ж цудоўным.

Калі вы будзеце больш любіць сябе і іншых, вы ўжо ў гэтым жыцці пачнеце бачыць кожнага чалавека і кожны аб'ект як дасканалую форму, якімі яны на самой справе і з'яўляюцца. Вы будзеце атрымліваць асалоду кожнае імгненне жыцця. А паколькі прыгажосць сапраўды знаходзіцца ў вачах таго, хто глядзіць, вашы вібрацыі таксама будуць цудоўнымі.

Калі вам добра — у гэтым няма нічога дрэннага. Вось адно з найбольш важных пасланняў прасвятлення.

Ва ўсім, што ўспрымаем, мы павінны старацца знайсці вышэйшы ўзровень задавальнення — боскае задавальненне.

Менавіта зараз унутры і вакол вас знаходзіцца рай, і, каб апынуцца ў ім, вам не трэба рабіць ніводнага руху... Вы можаце адкрыцца асляпляльнай дасканаласці таго, што вы бачыце і адчуваеце.

Ад вас ніколі не патрабуюць катаваць і расстройваць сябе. Вам не трэба нічога даказваць. Вы і не можаце нічога даказаць: вашы вібрацыі заўсёды гавораць праўду, пра іх нельга хлусіць.

Таксама няма нічога дрэннага ў задавальненні ад сексуальных адносін. Сапраўды, аргазм з'яўляецца хутчэй рэалізацыяй духу, чым тэхнічным дасягненнем. Цела — гэта экстатычнае тварэнне мноства істот, якія вібрыруюць на розных узроўнях свядомасці. Любоў — пападанне ў адну прастору ці на адзін вібрацыйны ўзровень з іншымі — з'яўляецца асновай нашай істоты і першая бясконца разнастайныя формы. Мы заўсёды атрымліваем такі сексуальны вопыт, які заслугоўваем, у залежнасці ад нашых любасных адносін да сябе і да іншых.

Экстаз сексу можа разглядацца як люстэрка, якое паказвае ступень нашага раставарэння ў прасторы братоў і сясцёр на вышэйшых узроўнях расшырэння. Заняткі сексам паказваюць нам, як адносіны на ўзроўні прасторы патрабуюць ад нас раствараецца ў любві і прыняць адрозненні, недасканаласці і прыгажосць іншых істот.

Працяг будзе.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
14 мая
Зак. 2188.
Т. 1000 экз.
220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.
Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.